5 (154)
май

Выдаецца
са студзеня 1993 г.

Пасведчанне
аб рэгістрацыі
№ 1221 ад
8 лютага 2010 г.

Выходзіць 12 разоў
у год (з ліпеня 2003 г.)

# БЕЛАРУСКІ ГІСТАРЫЧНЫ ЧАСОПІС

## НАВУКОВЫ, НАВУКОВА-МЕТАДЫЧНЫ ІЛЮСТРАВАНЫ ЧАСОПІС

**Заснавальнікі:**

**Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Выдавецтва «Адукацыя і выхаванне», дзяржаўная навуковая ўстанова «Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі», Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт**

*Галоўны рэдактар* ***Максім Навумавіч Гальпяровіч***

***Рэдакцыйная калегія:***
**Канстанцін Бандарэнка, Сымон Барыс, Пётр Брыгадзін, Рыгор Васілевіч, Вячаслаў Даніловіч, Валерый Жук, Мікалай Забаўскі, Віктар Іўчанкаў, Аляксандр Каваленя, Міхаіл Касцюк, Уладзімір Клюня, Веньямін Космач, Уладзімір Кошалеў, Васіль Кушнер, Надзея Кушнер, Уладзімір Ладысеў, Рыгор Лазько, Аляксандр Лакотка, Аляксей Літвін, Анатоль Люты, Вольга Ляўко, Ігар Марзалюк, Наталля Матусевіч, Аляксандр Радзькоў, Аркадзь Русецкі, Аляксандр Смолік, Сяргей Ходзін, Мечыслаў Часноўскі, Алег Яноўскі, Эдмунд Ярмусік.**

***Рэдакцыйная рада:***
**Уладзімір Адамушка, Юрый Бохан** (старшыня рады), **Марыя Бяспалая, Аляксандр Вабішчэвіч, Ала Галубовіч, Надзея Ганушчанка, Уладзімір Гілеп, Аляксандр Груша, Аляксандр Гужалоўскі, Таісія Доўнар, Дзяніс Дук, Ларыса Жэрка, Аляксандр Кахановіч, Марына Краснова, Іван Крэнь, Аляксандр Кушнярэвіч, Вячаслаў Лазіцкі, Святлана Марозава, Леанід Мартынаў, Сяргей Новікаў, Алег Слука, Валерый Талкачоў, Людміла Трыгорлава, Уладзімір Тугай, Віктар Фядосік, Неаніла Цыганок, Анатоль Шаркоў.**

***Рэдакцыя:***
Намеснік галоўнага рэдактара — **Наталля Матусевіч**, рэдактары аддзелаў — **Надзея Кушнер, Вітаўт Чаропка**, мастацкае афармленне — **Уладзімір Малахаў**, вёрстка — **Надзея Пяткоўская**, карэктура — **Галіна Шалюта**.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## ЗМЕСТ

| | | |
|---|---|---|
| | Слова ад рэдакцыі | 3 |
| | **ДА 1150-ГОДДЗЯ ПОЛАЦКА** | |
| Дзяніс Дук | Полацк IX—XI стагоддзяў: шлях да дзяржаўнасці | 4 |
| Сяргей Тарасаў | Старажытны Полацк: балканскі след | 9 |
| Марына Філіповіч | Полацкая зямля ў беларуска-літоўскай летапіснай традыцыі | 20 |
| Іна Калечыц | Графіці на слупах Полацкай Спаса-Праабражэнскай царквы | 32 |
| Алесь Суша | Бібліятэкі ў адукацыйнай прасторы даўняга Полацка | 38 |

Аляксандр КОРЗЮК

# Адлюстраванне гісторыі Беларусі канца XVIII — пачатку XX стагоддзя ў айчынных падручніках і вучэбных дапаможніках для сярэдняй школы

*Пры фарміраванні нацыянальнай сістэмы адукацыі за апошнія 20 гадоў былі створаны чатыры пакаленні вучэбных дапаможнікаў па гісторыі Беларусі. Аўтарскія калектывы, зыходзячы са сваіх метадалагічных пазіцый, трактавалі развіццё палітычных, эканамічных, культурных, нацыянальных працэсаў на беларускіх землях у канцы XVIII — пачатку XX ст. Кожнае новае пакаленне вучэбных дапаможнікаў спрыяе больш грунтоўнаму вывучэнню айчыннай гісторыі.*

*Традыцыйнае ўяўленне* пра падручнік па гісторыі заключаецца ў яго вызначэнні як "*...масавай вучэбнай кнігі, якая змяшчае прадметны змест адукацыі і вызначае віды дзейнасці, прызначаныя для абавязковага засваення вучнямі з улікам іх узроставых і іншых асаблівасцей*"[1]. У рамках *сучасных уяўленняў* пра гісторыю як працэс і вынік суб'ектыўных даследаванняў у педагагічным асяроддзі актыўна абмяркоўваюцца ідэі варыятыўнасці вучэбных кніг, разнастайнасці аўтарскіх апавяданняў і трактовак мінулага. Зыходзячы з гэтай пазіцыі, падручнік павінен дапамагчы вучням у канструяванні ўласнага гістарычнага аповяду, які пасадзейнічае ўсведамленню сувязі з мінулым, лепшаму разуменню сучаснасці і планаванню будучыні. Дадзены падыход дазваляе ставіцца да падручніка гісторыі як да *педагагічнага інструментарыя*, які ў рамках адукацыйнага працэсу дазваляе прадэманстраваць разнастайнасць інтэрпрэтацый гістарычнага мінулага і дапамагчы школьнікам зразумець прычыны гэтай разнастайнасці, раскрыць значэнне і перспектывы вывучэння мінулага для разумення сучасных падзей у кантэксце нацыянальнай, усходнеславянскай, агульнаеўрапейскай і сусветнай гісторыі.

Пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 21 студзеня 2005 г. "Аб зацвярджэнні інструкцыі аб парадку і выпуску вучэбных выданняў для ўстаноў адукацыі Рэспублікі Беларусь" вызначаецца, што падручнік — гэта вучэбнае выданне, у якім змяшчаецца сістэматызаваны пераказ вучэбнай дысцыпліны, а вучэбны дапаможнік — гэта вучэбнае выданне, якое дапаўняе або часткова (або поўнасцю) замяняе падручнік.

У артыкуле прасочваецца эвалюцыя выкладання матэрыялу па гісторыі Беларусі канца XVIII — пачатку XX ст. у падручніках для сярэдняй школы, аналізуецца іх змест у адпаведнасці з разгле-



*КО́РЗЮК Аляксандр Аляксандравіч.*
*Загадчык кафедры дапаможных гістарычных дысцыплін і методыкі выкладання гісторыі БДПУ імя Максіма Танка, кандыдат педагагічных навук. Нарадзіўся ў 1977 г. у Мінску. У 1999 г. закончыў гістарычны факультэт БДПУ імя Максіма Танка, у 2003 г. — аспірантуру пры ім. Лаўрэат прэміі "За асабісты ўклад у развіццё здольнасцей таленавітай моладзі" Спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы адораных вучняў і студэнтаў (2005 г.). Аўтар больш за 60 навуковых і метадычных публікацый, у тым ліку метадычнага дапаможніка "Шляхі фарміравання пазнавальнага інтарэсу вучняў у працэсе вывучэння гісторыі Беларусі ў школе (канец XVIII — пачатак XX ст.): метад. дапам." (Мн., 2005).*



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

джанымі падыходамі да вызначэння падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў. Дадзены гістарычны перыяд выбраны намі таму, што тады адбываліся лёсавызначальныя для беларускай нацыі і дзяржавы падзеі — уключэнне беларускіх зямель у склад Расійскай дзяржавы, у межах якой праходзіла фарміраванне этнічных, культурных, сацыяльна-эканамічных і палітычных перадумоў станаўлення беларускай нацыі, працэс мадэрнізацыі — пераход ад аграрна-рамеснага да індустрыяльнага грамадства.

Узнікае пытанне: калі ў савецкі час гісторыю Беларусі пачалі вывучаць як самастойны прадмет? У 1958 г. быў уведзены Закон аб школе і адбыўся пераход да ўсеагульнай васьмігадовай адукацыі. З 1957/1958 навучальнага года па рашэнню Міністэрства асветы СССР у школах было ўведзена вывучэнне гісторыі саюзных рэспублік. Рэспубліканскім міністэрствам асветы давалася права самім вызначаць, якім чынам яго арганізаваць. Каб пачаць вывучаць у школах Беларусі айчынную гісторыю, неабходна было вызначыць парадак яе выкладання і стварыць першы нацыянальны падручнік па гісторыі. У Міністэрстве асветы БССР вырашылі ўключыць у "Праграму па гісторыі СССР са старажытных часоў да нашых дзён для 7—10-х класаў": у адпаведныя раздзелы і тэмы 30 асобных урокаў і 32 пытанні па гісторыі БССР. Пры гэтым дадатковы час на вывучэнне пытанняў не выдзяляўся. Уключэнне айчыннай гісторыі ў праграмы сярэдняй школы хоць і было дастаткова фармальным, аднак стварала магчымасці для азнаямлення школьнікаў з галоўнымі фактамі па гісторыі беларускага народа, асноўнымі этапамі яго станаўлення і гістарычнага развіцця.

Стварэнне нацыянальнага падручніка па гісторыі было даручана загадчыку кафедры гісторыі Беларусі БДУ прафесару **Л.С.Абэцэдарскаму** і дацэнтам **М.П.Баранавай** і **Н.Г.Паўлавай**. У 1959 г. выйшаў падрыхтаваны гэтымі аўтарамі першы пробны варыянт падручніка, а ў 1960 г. — перапрацаваны і выпраўлены варыянт[2]. Падручнік не раз перавыдаваўся і выкарыстоўваўся ў навучальным працэсе да 1989 г.

У яго змесце гісторыі Беларусі канца XVIII — пачатку XX ст. былі прысвечаны 24 параграфы з 59. Яны вывучаліся ў 7-м (канец XVIII ст.), 8-м (XIX ст.) і 9-м (пачатак XX ст.) класах. Перыядызацыя дадзенай гістарычнай эпохі давалася ў адпаведнасці з фармацыйным падыходам, які панаваў у савецкай гістарыяграфіі: перыяд феадалізму (да 1861 г.), перыяд капіталізму (1861—1917 гг.), эпоха сацыялізму (з 1917 г.; у яе была ўключана глава "Беларусь у перыяд перарастання буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі ў рэвалюцыю сацыя-лістычную".) Змест аналізуемых параграфаў, як і падручніка ў цэлым, быў напісаны з марксісцкіх пазіцый і поглядаў на Беларусь як на Паўночна-Заходні край Расійскай Імперыі. У прыватнасці, у падручніку адзначалася, што "*...уз'яднанне Беларусі з Расіяй... адказвала яго* (беларускага народа. — **А.К.**) *кроўным інтарэсам, яго спрадвечнаму імкненню ўз'яднацца з родансным па паходжанні мове і культуры рускім народам*"[3]. Колькасны аналіз кампанентаў зместу гістарычнага матэрыялу дазваляе зрабіць выснову аб істотнай перавазе сацыяльна-палітычнай гісторыі, што звязана з падрабязным разглядам трох этапаў рэвалюцыйнага руху ў Расіі, які завяршыўся перамогай Кастрычніцкай рэвалюцыі.

У 1989 г. пад рэдакцыяй **Э.М.Загарульскага** пабачыў свет новы падручнік па гісторыі БССР для 8—9-х класаў[4]. Яго стварэнне было выклікана палітыкай перабудовы і галоснасці, як самі вызначылі сваю пазіцыю аўтары, пачаткам "*рэвалюцыйнага абнаўлення ўсіх бакоў жыцця сацыялістычнага грамадства*"[5]. Гісторыя Беларусі XIX ст. вывучалася ў 9-м класе ў адпаведнасці з ранейшай перыядызацыяй. Змест 19 параграфаў з 43, прысвечаных гэтаму гістарычнаму перыяду, быў напісаны з тых жа метадалагічных пазіцый, што і папярэдняе вучэбнае выданне. Аднак у параўнанні з падручнікам пад рэдакцыяй Л.С.Абэцэдарскага значна ўзрасла колькасць тэм па гісторыі беларускай культуры — больш падрабязна разглядалася развіццё асветы, навукі, беларускага фальклору, літаратуры і мастацтва як у першай палове XIX ст., так і ў 1860-я—1890-я гг. Упершыню разглядаўся грамадска-палітычны рух у Беларусі ў 1830—1850-я гг. (паўстанне 1830—1831 гг., дзейнасць "Дэмакратычнага таварыства" і "Саюза свабодных братоў", русіфікатарская палітыка царызму) і сітуацыя напярэдадні паўстання 1863 г. Больш падрабязна вывучалася развіццё капіталізму ў сельскай гаспадарцы і прамысловасці Беларусі пасля адмены прыгоннага права, асобны параграф быў прысвечаны паўстанню 1863 г. Падручнік вызначаўся большай інфарматыўнасцю, разнастайнасцю ілюстрацыйнага матэрыялу, лепшым метадычным апаратам. Ён быў перакладзены на беларускую мову і вытрымаў некалькі перавыданняў. Уводзіны да чацвёртага выдання пад назвай "Гісторыя Беларусі", зробленага ў 1992 г., ужо не змяшчаюць упамінанняў аб Камуністычнай партыі і "братэрскім саюзе савецкіх рэспублік"[6]. Іншых змяненняў у змест падручніка ўнесена не было.

Пасля абвяшчэння суверэнітэту ў Рэспубліцы Беларусь адбывалася станаўленне нацыянальнай сістэмы школьнай гістарычнай адукацыі, распрацоўка вучэбнай літаратуры па айчыннай гісторыі для агульнаадукацыйнай школы. У 1990 г. пачалася работа па стварэнні **Канцэпцыі гістарычнай адукацыі ў сярэдняй школе Беларусі** навуковым калектывам у складзе М.В.Біча (кіраўнік), І.І.Багдановіча, Г.А.Космача, А.М.Лютага і У.К.Пляшэвіча[7]. Працэс яе фарміравання быў абумоўлены па-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

літыкай нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва ў пачатку 1990-х гг. і неабходнасцю абгрунтавання беларускай дзяржаўнасці.

Аўтары Канцэпцыі прааналізавалі стан гістарычнай адукацыі ў краіне і адзначылі, што ў дзеючай сістэме адукацыі практычна ігнаруецца вывучэнне гісторыі Беларусі, што вядзе да вынішчэння нацыянальнай самасвядомасці беларусаў[8]. Для пераважнай большасці насельніцтва рэспублікі гісторыя сваёй Бацькаўшчыны заставалася невядомай. Менавіта таму вывучэнню ў школе гісторыі Беларусі аўтары прапанавалі адвесці не менш за $^1/_3$ часу, прызначанага для вывучэння гісторыі ў школе.

У аснову вызначэння зместу школьнай гістарычнай адукацыі аўтары Канцэпцыі прапанавалі пакласці прынцыпы дэпартызацыі і дэідэалагізацыі, якія павінны рэалізавацца ў выніку адмовы ад ідэалагічных штампаў і догмаў марксісцка-ленінскай метадалогіі, ад выкарыстання гісторыі як інструмента насаджэння ідэалогіі якой-небудзь партыі. Вызначальным прынцыпам фарміравання зместу гістарычнай адукацыі абвяшчалася гуманізацыя ўсіх школьных курсаў, плюралістычная тэорыя і метадалогія, заснаваныя на творчым асэнсаванні і засваенні розных навуковых канцэпцый, вывучэнні і аналізу сусветна-гістарычнага працэсу развіцця грамадства.

Канцэпцыя вызначыла асноўныя прынцыпы пабудовы школьных курсаў гісторыі. Найбольш аптымальным яе варыянтам было прызнана спалучэнне цывілізацыйнага і фармацыйнага прынцыпаў. Пры вызначэнні структуры школьнага выкладання гісторыі настаўнікам прапаноўвалася кіравацца прынцыпамі ўзаемасувязі айчыннай і сусветнай гісторыі, канцэнтрызму. Прапаноўвалася распрацаваць некалькіх варыянтаў праграм навучання і новых падручнікаў. Новая структура прадугледжвала вывучэнне гісторыі ў двух канцэнтрах — 5-я—9-я класы — эмпірычны (падзейна-храналагічны) узровень, 10-я—11-я класы — праблемна-тэарэтычны ўзровень.

Напярэдадні распаду СССР Канцэпцыя была прынята калегіяй Міністэрства асветы БССР і 30 лістапада 1991 г. апублікавана ў "Настаўніцкай газеце"[9]. У 1992/93 навучальным годзе за кароткі тэрмін былі падрыхтаваны першыя варыянты вучэбных праграм. Першыя вучэбныя дапаможнікі з'явіліся толькі да 1993/94 навучальнага года. Вучэбны матэрыял друкаваўся ў "Настаўніцкай газеце" напярэдадні правядзення адпаведных урокаў, бо папярэдні падручнік не адпавядаў новаму зместу гістарычнай адукацыі.

Для арганізацыі вывучэння гісторыі Беларусі ў пераходны перыяд для вучняў 10-х—11-х класаў, якія раней вучыліся па падручніку пад рэдакцыяй Э.М.Загарульскага, у 1992 г. быў выдадзены вучэбны дапаможнік пад рэдакцыяй **У.Н.Сідарцова**. Уступны артыкул "Ад аўтараў" быў вытрыманы ў рэчышчы асноўных палажэнняў Канцэпцыі гістарычнай адукацыі ў сярэдняй школе Беларусі. Адзначаўся глыбокі і ўсебаковы крызіс гістарычнай навукі і адукацыі як адна з прычын панавання таталітарнага рэжыму, заснаванага на ідэалогіі марксізму-ленінізму, ператварэнне гісторыі ў "служанку палітыкі". Аўтары ўсведамлялі неабходнасць пераасэнсавання гісторыі Беларусі, асабліва савецкага перыяду, асвятленне якога, на іх думку, было сфальсіфікавана ў большай ступені. Таму імі была зроблена спроба напісаць гісторыю з нацыянальных падыходаў, аб'ектыўна падысці да аналізу і ацэнкі падзей і фактаў, уключыць у змест дапаможніка новыя матэрыялы па асобных праблемах. Гісторыя Беларусі ў 10-м класе вывучалася з 1900 па 1917 г., бо папярэдні падручнік заканчваўся падзеямі канца XIX ст. Аўтары такую перыядызацыю і структуру вучэбнага курса не прызналі навуковай, але яны былі вымушаны да яе прыстасоўвацца[10]. Падзеям пачатку XX ст. было прысвечана 13 параграфаў з 51, метадычны апарат быў прадстаўлены толькі пытаннямі і заданнямі пасля параграфаў.

У 1993 г. выйшла другое, перапрацаванае выданне дадзенага дапаможніка. У прадмове аўтары падкрэслівалі неабходнасць асвятлення айчыннай гісторыі з нацыянальна-дзяржаўных пазіцый, выкарыстання гуманістычных агульначалавечых каштоўнасцей у якасці крытэрыяў ісціны і ацэнкі гістарычных падзей. У абодвух дапаможніках раздзелы, прысвечаныя 1900—1917 гг., былі напісаны прафесарам М.В.Бічом. У структуры другога выдання дапаможніка адбыліся пэўныя змены. Параграф "Узмацненне шавінізму ў палітыцы царызму" быў перанесены з главы "Культура Беларусі ў пачатку XX ст." у главу "Сацыяльна-эканамічнае развіццё. Сталыпінскія рэформы. Грамадскі рух". Параграф "Грамадскі рух. Увядзенне земстваў" быў падзелены на дзве часткі: матэрыял аб увядзенні земстваў быў перанесены ў змест параграфа "Аграрная рэформа і развіццё сельскай гаспадаркі", а пра грамадскі рух — у параграф "Узмацненне шавінізму ў палітыцы царызму". У сувязі з гэтым колькасць параграфаў, прысвечаных гісторыі пачатку XX ст. у другім выданні дапаможніка скарацілася да 12[11].

Такім чынам, для стварэння вучэбных дапаможнікаў па айчыннай гісторыі, якія адпавядалі б новай структуры і зместу гістарычнай адукацыі, быў назапашаны пэўны станоўчы вопыт.

На працягу 1993—1997 гг. было выдадзена *першае пакаленне* вучэбных дапаможнікаў па гісторыі Беларусі для II і III ступеняў агульнай сярэдняй адукацыі *(гл. табліцу)*. Згодна з канцэнтрычным прынцыпам пабудовы зместу вучэбных праграм, гісторыя Беларусі канца XVIII — пачатку XX ст. вывучалася ў 8 класе[12]. Першыя дапаможнікі ў значнай ступені ўяўлялі сабой канспекты лекцый аўтараў, вядомых у Беларусі навукоў-



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

цаў — Г.В.Штыхава, П.А.Лойкі, В.М.Фаміна, У.Н.Сідарцова, М.В.Біча і іншых, якія яны чыталі для студэнтаў гістарычных факультэтаў ВНУ. Дапаможнікі адрозніваліся сціплым паліграфічным выкананнем, апарат засваення ведаў і арганізацыі самастойнай працы вучняў практычна адсутнічаў.

Першы дапаможнік па гісторыі Беларусі разглядаемага перыяду для 8-га класа быў выдадзены ў рэдакцыі аўтара, прафесара **М.В.Біча**[13]. Яго з'яўленне адыграла станоўчую ролю ў забеспячэнні вучняў і педагогаў вучэбнай літаратурай па прадмету і дало магчымасць пачаць работу па распрацоўцы новых, больш дасканалых дапаможнікаў.

Выданне *другога пакалення* вучэбных дапаможнікаў ажыццяўлялася ў 1997—2000 гг. Іх змест быў у большай ступені адаптаваны да ўзроставых асаблівасцей вучняў. Выдадзеныя ў гэты час дапаможнікі мелі адаптаваны тэкст, распрацаваны метадычны апарат, у склад аўтарскіх калектываў увайшлі метадысты і настаўнікі-практыкі. У 1998 г. было выдадзена першае[14], а ў 2000 г. — другое выданне істотна перапрацаванага вучэбнага дапаможніка **М.В.Біча** пад рэдакцыяй Я.М.Бабосава[15]. Фактычна ён стаў першай спробай напісання падручніка для вучняў 8-га класа. Аднак яго змест не ў поўнай меры адпавядаў пазнавальным магчымасцям школьнікаў дадзенага ўзросту. Асобныя тэмы былі перагружаны фактaлагічным матэрыялам, што зніжала эфектыўнасць яго засваення. Разам з тым, трэба адзначыць вялікую колькасць сродкаў выяўленчай і ўмоўна-графічнай нагляднасці — табліц, схем, графікаў, дыяграм, размешчаных у дапаможніку.

У адпаведнасці з вучэбнай праграмай у разглядаемых дапаможніках прапаноўвалася наступная перыядызацыя гісторыі Беларусі канца XVIII — пачатку XX ст.: канец XVIII ст. — 1850-я гг. — крызіс феадальна-прыгонніцкай сістэмы; 1860—1890-я гг. — станаўленне буржуазнага грамадства; пачатак XX ст. — наспяванне крызісу самадзяржаўя. У іх змесце рабілася спроба пераадолець усталяваныя ў савецкай гістарыяграфіі погляды на такія гістарычныя падзеі, як далучэнне беларускіх зямель да Расійскай Імперыі, рэвалюцыйна-вызваленчая барацьба і дзейнасць палітычных партый у канцы XIX — пачатку XX ст., беларускі адраджэнскі рух. На думку аўтара, менавіта гэтыя пытанні больш за ўсё "*ў бальшавіцкай гістарыяграфіі скажаліся да непазнавальнасці гістарычных рэалій*". У дапаможніках, выдадзеных у 1998 і 2000 гг., прысутнічалі больш мяккія і ўзважаныя ацэнкі знаходжанню беларускіх зямель у складзе Расіі, якія ў дапаможніку 1993 г. адназначна трактаваліся як "захоп", называліся "азіяцкім дэспатызмам", а становішча Беларусі — каланіяльным[16].

У якасці паралельнага вучэбнага дапаможніка па гісторыі Беларусі канца XVIII — пачатку XX ст. было выпушчана выданне **В.А.Мілаванава**[17]. У ім у найбольшай ступені прадстаўлена сацыяльна-эканамічнае развіццё беларускіх зямель. Параграфы дапаўняліся фрагментамі некаторых гістарычных крыніц і мастацкіх твораў, была размешчана недастатковая колькасць карт. Метадычны апарат быў прадстаўлены толькі пытаннямі пасля параграфаў.

Адначасова з выданнем дадзеных вучэбных дапаможнікаў ажыццяўлялася праца па стварэнні і апрабацыі *трэцяга пакалення*, што было звязана з пераходам сярэдняй школы на 12-гадовы тэрмін навучання. Яны якасна адрозніваліся ад папярэдніх навукова-метадычным узроўнем распрацоўкі, рэцэнзавання і ступенню апрабацыі. Змест вучэбнага матэрыялу дапаможніка для вучняў 8-га класа пад рэдакцыяй **М.С.Сташкевіча**[18] адпавядаў пазнавальным магчымасцям школьнікаў, прычым асаблівую ўвагу аўтары надалі фарміраванню ў іх спосабу дзейнасці са зместам вучэбнага дапаможніка. У дапаможніку прапаноўвалася новая перыядызацыя дадзенага гістарычнага перыяду — "Беларусь на зыходзе феадалізму (канец XVIII — сярэдзіна XIX ст.)" і "Усталяванне капіталізму на беларускіх землях. Нацыянальнае адраджэнне (1860-я гг. — пачатак XX ст.)". Аднак у назве кнігі гістарычны адрэзак часу падаваўся як XIX ст. — 1917 г.

Дапаможнікі трэцяга пакалення былі выдадзены для 5-х—10-х класаў і выходзілі да 2006 г., пасля чаго ў сувязі з вяртаннем агульнаадукацыйнай школы з 1 верасня 2008 г. на 11-гадовы тэрмін навучання работа па іх напісанню для іншых класаў была спынена.

У 2009 г. былі зацверджаны **Канцэпцыя і Адукацыйны стандарт вучэбнага прадмета "Сусветная гісторыя. Гісторыя Беларусі"**. Гэтымі дакументамі вызначаліся мэты, задачы, асноўныя функцыі, структура, змест школьнай гістарычнай адукацыі і патрабаванні да ўзроўню падрыхтоўкі вучняў. Устанаўлівалася, што структура гістарычнай адукацыі ў сярэдняй школе будуецца па лінейнаму прынцыпу навучання[19]. У новых вучэбных праграмах упершыню вызначаліся навуковыя палажэнні, якія клаліся ў аснову распрацоўкі зместу новага пакалення дапаможнікаў па гісторыі[20].

У 2011 г. быў выпушчаны новы вучэбны дапаможнік па гісторыі Беларусі для 11-гадовай школы, у якой дадзены гістарычны перыяд вывучаецца ўжо ў 9-м класе[21]. Гэты дапаможнік — дапоўненае і перагледжанае выданне кнігі, што выйшла ў 2005 г. У назве выдання вызначаны крыху зменены храналагічныя рамкі перыяду (канец XVIII — пачатак XX ст.). Яго этапы і структура дапаможніка засталіся нязменнымі. Змест вучэбнага дапаможніка адпавядае сучаснаму ўзроўню развіцця айчыннай гістарычнай навукі. Асаблівая ўвага надаецца азнаямленню вучняў з месцам беларускай культуры ў сусветнай культуры. Можна лічыць, што пры напісанні вучэбнага дапаможніка былі ў дастатковай ступені ўлічаны ўзроставыя пазна-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

вальныя магчымасці вучняў і іх адукацыйны ўзровень, бо ступень складанасці вучэбнага матэрыялу ўзрастае паступова, а тэкст напісаны зразумелай даступнай мовай. Выданне мае добра распрацаваны метадычны апарат, вялікую колькасць ілюстрацый, карт, табліц, фрагментаў дакументаў і твораў мастацкай літаратуры.

На **III ступені** агульнай сярэдняй адукацыі гісторыя Беларусі канца XVIII — пачатку XX ст. да 2008/2009 навучальнага года вывучалася ў 11-м класе, што было звязана з канцэнтрычнай пабудовай вучэбнай праграмы па прадмету; да канца 2012/2013 навучальнага года ў адпаведнасці з пераходнай вучэбнай праграмай яна таксама вывучаецца выпускнікамі сярэдніх школ[22]. У першым выпадку ў вучэбным працэсе выкарыстоўваліся чатыры вучэбныя дапаможнікі, з 2009/2010 навучальнага года ў школах працуюць па дапаможніку пад рэдакцыяй Я.К.Новіка.

У першым варыянце дапаможніка, які выйшаў у 1996 г., прыводзілася перыядызацыя дадзенага адрэзку гістарычнага часу, аналагічная той, што прапаноўвалася ў дапаможніках М.В.Біча для 8-га класа, але структура самога дапаможніка ёй не адпавядала[23]. Змест гістарычнага матэрыялу быў падзелены на два раздзелы: "На зыходзе прыгонніцкай эпохі (канец XVIII — 50-я гг. XIX ст.)" і "Пераход да рыначнай гаспадаркі. Барацьба за дэмакратыю і нацыянальнае адраджэнне (60-я гг. XIX ст. — 1917 г.)"[24]. Гэта несупадзенне было выпраўлена ў дапаможніку для 11-га класа *другога пакалення*, у змесце якога разглядаліся ўжо два перыяды ў гісторыі Беларусі гэтага часу[25]. Праўда, назва другога раздзела гучыць стандартна, без якога-небудзь удакладнення — "Беларусь у перыяд капіталізму". Некалькі змяніўся калектыў аўтараў — у напісанні адпаведных раздзелаў дадзенага дапаможніка прынялі ўдзел В.А.Цяплова, Н.Я.Новік, І.Л.Качалаў і Г.С.Марцуль. Пры нязначных зменах ва ўнутранай структуры тэм змест гістарычнага матэрыялу ў параўнанні з папярэднім выданнем не зведаў істотных змяненняў.

У гістарычнай навуцы існуюць розныя погляды на гісторыю Беларусі канца XIX—пачатку XX ст. Таму менавіта па гэтаму перыяду было выдадзена некалькі *паралельных дапаможнікаў* — пад рэдакцыяй **М.С.Сташкевіча**[26] тыражом 17 100 экзэмпляраў, **А.А.Кавалені**[27] тыражом 5 025 экзэмпляраў і **Я.І.Трашчанка** тыражом 2 140 экзэмпляраў на рускай мове і 3 210 на беларускай мове[28]. У першым з іх асаблівая ўвага звернута на паваротныя падзеі, якія мелі лёсавызначальнае значэнне для нашай краіны. Аўтары паспрабавалі паказаць гісторыю Беларусі ў кантэксце агульнаславянскай і еўрапейскай гісторыі. Дастаткова вялікая ўвага надавалася разгляду айчыннай культуры дадзенага перыяду. Змест гістарычнага матэрыялу ўключаў у сябе 16 параграфаў і быў размеркаваны па двух перыядах: першая палова XIX ст. і 1860-я гг. — 1917 г.

Вучэбны дапаможнік пад рэдакцыяй **А.А.Кавалені** адметны тым, што яго з'яўленне павінна было забяспечыць дыферэнцыраванае навучанне гісторыі на базавым і павышаным узроўнях. Матэрыял, прызначаны для вывучэння на павышаным узроўні, змяшчаўся ў рубрыцы "Гістарычная даведка". Аднак, як адзначалі аўтары, гэты падзел меў рэкамендацыйны характар: калі матэрыял цікавы для вучняў, якія вывучаюць гісторыю на базавым узроўні, яны маглі таксама пазнаёміцца з ім. Гісторыя Беларусі вывучаемага храналагічнага адрэзку была падзелена на два перыяды: "На зыходзе прыгонніцкай эпохі (канец XVIII — першая палова XIX ст.)" і "Станаўленне буржуазнага грамадства (1860-я гг. — 1917 г.)". У змесце 26 параграфаў падрабязна разглядаюцца тэрыторыя і насельніцтва беларускіх зямель, органы ўлады і кіравання ў канцы XVIII — першай палове XIX ст., грамадскі рух, вайна 1812 г., рэвалюцыйныя гурткі 1830-х — 1850-х гг. Вялікая ўвага надавалася асвятленню беларускай культуры, у тым ліку побыту, матэрыяльнай культуры, вуснай народнай творчасці і г.д. Аналіз дапаможніка дазваляе зрабіць выснову, што аўтарам у значнай ступені ўдалося рэалізаваць прынцып аб'ектыўнасці пры раскрыцці сутнасці гістарычных падзей. Дапаможнік меў добра распрацаваны апарат засваення ведаў, пытанні і заданні для самакантролю, сістэматызацыі і абагульнення ведаў. Гэта тлумачыцца тым, што ў стварэнні метадычнага забеспячэння прымалі ўдзел метадысты В.В.Гінчук, М.А.Краснова і выкладчык Ліцэя БДУ Т.Ф.Ходзіна.

Дапаможнік пад рэдакцыяй **Я.І.Трашчанка** займае асобнае месца ў шэрагу аналізуемых вучэбных кніг. У якасці рубяжа паміж гістарычнымі перыядамі, якія вывучаліся ў 10 і 11 класах, у ім вызначаецца Кастрычніцкая рэвалюцыя 1917 г., таму ўвесь "дасавецкі" перыяд разглядаецца ў 10-м класе. Знаходжанню беларускіх зямель у складзе Расійскай Імперыі прысвечаны 10 параграфаў. У змесце дапаможніка сустракаюцца дастаткова спрэчныя і супярэчлівыя тэзісы, якія не ў поўнай меры маюць дачыненне да зместу вучэбнай праграмы. Так, у параграфе "Становление белорусской нации. Белорусская культура в XIX — начале XX в." сцвярджаецца, што "*...нельзя признать прогрессивным любое стремление малого народа к государственному обособлению только на том основании, что у него имеются этнические отличия и претенденты на роль этнической элиты*"[29].

Асноўныя падзеі сацыяльна-палітычнага і нацыянальна-культурнага жыцця на беларускіх землях у канцы XVIII — пачатку XX ст. разглядаюцца з пазіцый, якія сфарміраваліся ў дарэвалюцыйнай расійскай гістарыяграфіі і затым замацаваліся ў савецкай гістарычнай навуцы. Гэта тычыцца

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ




ацэнкі далучэння беларускіх зямель да Расійскай Імперыі, канфесіянальнага становішча і працэсаў па фарміраванні нацыі на беларускіх землях, паўстанняў 1830—1831 гг. і 1863—1864 гг., беларускага нацыянальнага руху ў пачатку XX ст. Усходнія славяне разглядаюцца ў якасці трыадзінага народа[30]; выкарыстанне лацініцы — працэсам, што надаваў беларускай мове антыбеларускі характар[31]. Беларускі нацыянальны рух характарызуецца як нацыянальна-экстрэмісцкі, вузкасектанцкі і агрэсіўна-сепаратысцкі, які ўзнік "*...в ренегатской среде ополяченной шляхты*"[32]. Як бачна, для дадзенага вучэбнага дапаможніка характэрны публіцыстычны, часам палемічны стыль выкладання матэрыялу, што не ў поўнай меры ўласціва вучэбнай літаратуры падобнага кшталту. У параўнанні з іншымі дапаможнікамі ў ім пераважаюць аднабаковыя і не заўсёды карэктныя ацэнкі гістарычных з'яў і падзей.

На сённяшні дзень па айчыннай гісторыі дадзенага перыяду для вучняў 11-га класа аўтарскім калектывам на чале з Я.К.Новікам быў падрыхтаваны дапаможнік, які выйшаў у 2009 г.[33]. Як і ў дапаможніку пад рэдакцыяй М.С.Сташкевіча, гістарычныя падзеі разглядаюцца з пачатку XIX ст. Пры гэтым раздзел "Беларусь у XIX — пачатку XX ст." складаюць дзевяць параграфаў, а два параграфы, прысвечаныя становішчу Беларусі ў гады Першай сусветнай вайны і Лютаўскай рэвалюцыі, насуперак сфарміраванай перыядызацыі, аднесены да раздзелу II "Беларусь у XX — пачатку XXI ст.". У цэлым у дадзеным дапаможніку адбылося пэўнае скарачэнне аб'ёму гістарычнага матэрыялу ў параўнанні з раней існуючымі выданнямі.

Нягледзячы на тое, што змест аналізуемых пяці вучэбных дапаможнікаў прысвечаны аднаму і таму ж гістарычнаму перыяду, а тры з іх маюць агульны састаў аўтараў (Я.К.Новік, І.Л.Качалаў, В.А.Цяплова, Н.Я.Новік), у іх не аднолькава асвятляюцца гістарычныя падзеі. Так, напрыклад, у двух дапаможніках пад рэдакцыяй Я.К.Новіка не разглядаецца вайна 1812 г.

Але найбольш паказальным будзе аналіз таго, як у змесце вучэбных дапаможнікаў трактуюцца заканчэнне і вынікі рэвалюцыі 1905—1907 гг. У дапаможніках пад рэдакцыяй Я.К.Новіка падзеі 3 чэрвеня 1907 г. (апублікаванне Маніфесту аб роспуску II Думы і змяненні выбарчага закона) разглядаюцца як "дзяржаўны пераварот", "*...па сутнасці дзяржаўны пераварот*" і паведамляецца, што рэвалюцыя скончылася паражэннем, "*але гэта не азначала вяртанне да мінулага*"[34]. Па іншаму гэтае пытанне асвятляецца ў дапаможніку пад рэдакцыяй М.С.Сташкевіча: "*Гэтая падзея атрымала ў гісторыі назву трэцячэрвеньскага дзяржаўнага перавароту, хаця на самой справе перавароту не было, а быў уведзены новы выбарчы закон, які змяніў палі-*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Вучэбныя дапаможнікі па гісторыі Беларусі (канец XVIII — пачатак XX ст.)**
***(выдадзеныя ў 1993—2011 гг.)***

| Пакаленне вучэбных дапаможнікаў | II ступень агульнай сярэдняй адукацыі | III ступень агульнай сярэдняй адукацыі |
|---|---|---|
| | *11-гадовая школа, канцэнтрычны прынцып пабудовы зместу гістарычнай адукацыі* | |
| I | Біч М.В. Гісторыя Беларусі: канец XVIII ст. — 1917 г.: вучэб. дапам. для 8-га кл. (Мн., 1993) | Загарульская В.Э., Качалаў І.Л., Лютава В.У. [і інш.]. Гісторыя Беларусі: канец XVIII — 1996 г.: вучэб. дапам. для вучняў 11-га кл. У 2 кн. Кн. 1; пад рэд. Я.К.Новіка, В.А.Цяпловай (Мн., 1996) |
| II | Біч М.В. Гісторыя Беларусі: канец XVIII ст. — 1917 г.: вучэб. дапам. для 8-га кл.; пад рэд. Я.М.Бабосава (Мн., 1998, 2000) | Качалаў І.Л., Марцуль Г.С., Новік Н.Я. [і інш.]. Гісторыя Беларусі: канец XVIII — 1999 г.: вучэб. дапам. для 11-га кл.; пад рэд. Я.К.Новіка (Мн., 2000) |
| | Мілаванаў В.А. Гісторыя Беларусі: канец XVIII ст. — 1917 г.: вучэб. дапам. для 8-га кл. (Мн., 2000) | Паноў С.В., Сідарцоў У.Н., Фамін В.М. Гісторыя Беларусі: XIX — XX стст.: вучэб. дапам. для 11-га кл.; пад рэд. М. С. Сташкевіча (Мн., 2001) |
| | | Гісторыя Беларусі, XIX — пачатак XXI ст.: вучэб. дапам. для 11-га класа ўстаноў, якія забяспечваюць атрыманне агульнай сярэдняй адукацыі, з беларускай і рускай мовамі навучання з 11-гадовым тэрмінам навучання (базавы і павышаны ўзроўні) / І.І.Коўкель, Э.С.Ярмусік; пад рэдакцыяй А.А.Кавалені. (Мн., 2006) |
| | | Трещенок Я.И., Воробьёв А.А., Волженков В.В. История Беларуси с древнейших времён до октября 1917 г.: учеб. пособие для 10 кл. (Мн., 2008) |
| | *12-гадовая школа, канцэнтрычны прынцып пабудовы зместу гістарычнай адукацыі* | |
| III | Сосна У.А. Марозава С.В., Паноў С.В. Гісторыя Беларусі (XIX ст. — 1917 г.): вучэб. дапам. для 8-га кл.; пад рэд. М.С.Сташкевіча (Мн., 2005) | Не былі выпушчаны ў сувязі з пераходам на 11-гадовы тэрмін навучання. |
| | *11-гадовая школа, лінейны прынцып пабудовы зместу гістарычнай адукацыі* | |
| IV | Марозава С.В., Сосна У.А., Паноў С.В. Гісторыя Беларусі, канец XVIII — пачатак XX ст.: вучэб. дапам. для 9-га кл.; пад рэд. У.А.Сосны (Мн., 2011) | Новік Я.К. [і інш.]. Гісторыя Беларусі, XIX — пачатак XXI ст.: вуч. дапам. для 11-га кл. (Мн., 2009) |

*тычны расклад сіл у Думе*". Далей на падставе аналізу заваёў рэвалюцыі робіцца выснова аб тым, што на з'яўлялася лагічным працягам той мадэрнізацыі грамадства, якая пачалася яшчэ ў XIX ст., адак дэмакратычныя пераўтварэнні ў яе час насілі бмежаваны характар, а нацыянальнае і аграрнае ытанні так і не былі вырашаны[35]. У дапаможніку ад рэдакцыяй Я.І.Трашчанка падзеі рэвалюцыі 905—1907 гг. фактычна не разглядаюцца. У змесе двух абзацаў, прысвечаных гэтай падзеі, гавора ў асноўным вядзецца аб аграрных хваляваннях. дачыненні да заканчэння рэвалюцыі аўтарамі карыстаны эпітэт "утихшая"[36].

Як бачна, асвятленне адных і тых жа падзей моа прыкметна адрозніваецца, што ў першую чаргу умачыцца навукова-метадалагічнымі пазіцыямі, іх прытрымліваліся самі аўтары дапаможнікаў. сувязі з гэтым вызначэнне ў 2009 г. Канцэпцыяй эбнага прадмета "Сусветная гісторыя. Гісторыя ларусі" навуковых палажэнняў, згодна з якімі вінна асвятляцца гісторыя Беларусі, з'яўляецнадзвычай важным для аб'ектыўнага разгляду ыннай гісторыі на старонках вучэбных дапаможаў для сярэдняй школы.

Такім чынам, намі праведзены аналіз 19 падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў, у якіх разглядалася айчынная гісторыя канца XVIII — пачатку XX ст. Першы з іх быў выпушчаны ў 1960 г., апошні — у 2011 г. За мінулае паўстагоддзе ў вывучэнні гісторыі Беларусі адбыліся карэнныя змены, звязаныя з якасным абнаўленнем зместу вучэбных гістарычных ведаў. Дэмакратызацыя грамадства, набыццё дзяржаўнага суверэнітэту патрабавалі ўсебаковага вывучэння гістарычнага мінулага сваёй краіны.

Пры ўсіх недахопах, выкліканых імкненнем выпрацаваць "нацыянальны" падыход да вывучэння айчыннай гісторыі, у тым ліку і за кошт адмаўлення папярэдняга гістарычнага і навуковага вопыту, аўтары вучэбных дапаможнікаў для сярэдняй школы першага пакалення змаглі пераадолець у іх змесце сфарміраваную ў ранейшых выданнях карціну эканамічна і культурна адсталай напярэдадні Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г. Беларусі.

Для нацыянальных дапаможнікаў другога пакалення характэрна большая ў параўнанні з папярэднімі выданнямі ступень карэктнасці, гістарычнай аб'ектыўнасці і ўзважанасці ў ацэнках фактаў і падзей, адлюстраванне разнастайных поглядаў на

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

гістарычныя працэсы, якія мелі месца на беларускіх землях у складзе Расійскай Імперыі.

Вучэбныя дапаможнікі трэцяга і чацвёртага пакаленняў адрозніваюцца грунтоўнай канцэптуальнай пабудовай, імкненнем да навуковай аб'ектыўнасці, улікам узроставых асаблівасцей вучняў і добра распрацаваным апаратам арганізацыі засваення гістарычных ведаў.

У нацыянальнай сістэме школьнай гістарычнай адукацыі была рэалізавана спроба выкарыстання паралельных вучэбных дапаможнікаў, што ў некаторай ступені спрыяла фарміраванню плюралістычных поглядаў на гісторыю. Выпрацоўка адзіных падыходаў, у адпаведнасці з якімі павінна весціся выкладанне гісторыі Беларусі і якія былі пакладзены ў аснову распрацоўкі вучэбных дапаможнікаў, зафіксаваны ў Канцэпцыі вучэбнага прадмета "Сусветная гісторыя. Гісторыя Беларусі" і вучэбных праграмах 2009 г., прадвызначыла навукова абгрунтаваны змест чацвёртага пакалення. На сённяшні дзень практыка выдання альтэрнатыўных дапаможнікаў не атрымала свайго працягу, аднак у змесце новых дапаможнікаў паступова павялічваецца тэндэнцыя да рэалізацыі шматпланавасці вучэбнага тэксту і яго інтэрпрэтацый, што адпавядае сучасным кірункам у развіцці гістарычнай навукі.

[1] Студеникин, М.Т. Методика преподавания истории в школе: учеб. для студ. высш. учеб. заведений. М., 2003. С. 41.

[2] История БССР: учебник для учащихся сред. школы / Л.С.Абецедарский, М.П.Баранова, Н.Г.Павлова; под ред. Л.С.Абецедарского. Мн., 1960.

[3] Там жа. С. 66.

[4] История БССР: учеб. для 8—9-х кл. сред. шк. / М.П.Баранова, Э.М.Загорульский, Н.Г.Павлова; под ред. Э.М.Загорульского. Мн., 1989.

[5] Гісторыя БССР : падруч. для 8—9-х кл. сярэд. шк. / М.П.Баранава, Э.М.Загарульскі, Н.Г.Паўлава; пад рэд. Э.М.Загарульскага. Выд. 3-е. Мн., 1991.

[6] Там жа. С. 3—4.

[7] Багдановіч І.І. Методыка выкладання гісторыі ў школе: вучэб. дапам. Мн., 2009.

[8] Канцэпцыя гістарычнай адукацыі ў сярэдняй школе Беларусі // Настаўніцкая газета. 1991, 30 лістапада. С. 2.

[9] Там жа.

[10] Там жа. История Беларуси: XX в.: учеб. пособие для 10—11-х кл. сред. шк. / М.О.Бич, В.Н.Сидорцов, В.М.Фомин; под ред. В.Н.Сидорцова. Мн., 1992. С. 3—4.

[11] Гісторыя Беларусі: XX ст.: вучэб. дапам. для 10—11-х кл. сярэд. шк. / М.В.Біч, У.Н.Сідарцоў, В.М.Фамін. Выд. 2-е, перапрац. Мн., 1993. С. 4.

[12] Праграмы для сярэдніх навучальных устаноў. Гісторыя. Гісторыя Беларусі. Мн., 1995.

[13] Біч М.В. Гісторыя Беларусі: канец XVIII ст. — 1917 г.: вучэб. дапам. для 8-га кл. Мн., 1993.

[14] Біч М.В. Гісторыя Беларусі: канец XVIII ст. — 1917 г.: вучэб. дапам. для 8-га кл. агульнаадукац. шк. / пад рэд. Я.М.Бабосава. Мн., 1998.

[15] Біч М.В. Гісторыя Беларусі: канец XVIII ст. — 1917 г.: вучэб. дапам. для 8-га кл. агульнаадукац. шк. / пад рэд. Я.М.Бабосава. 2-е выд. Мн., 2000.

[16] Біч М.В. Гісторыя Беларусі: канец XVIII ст. — 1917 г.: вучэб. дапам. для 8-га кл. С. 4—5; Біч М.В. Гісторыя Беларусі: канец XVIII ст. — 1917 г. : вучэб. дапам. для 8-га кл. агульнаадукац. шк. / пад рэд. Я.М.Бабосава. 2-е выд. С. 4.

[17] Мілаванаў В.А. Гісторыя Беларусі: канец XVIII ст. — 1917 г.: вучэб. дапам. для 8-га кл. агульнаадукац. шк. з бел. і рус. мовамі навучання. 2-е выд. Мн., 2000.

[18] Гісторыя Беларусі (XIX ст. — 1917 г.): вучэб. дапам. для 8-га кл. устаноў, якія забяспечваюць атрыманне агул. сярэд. адукацыі, з бел. і рус. мовамі навучання з 12-гадовым тэрмінам навучання / У.А.Сосна, С.В.Марозава, С.В.Паноў; пад рэд. М.С.Сташкевіча. Мн., 2005.

[19] Концепция учебного предмета "Всемирная история. История Беларуси" // Гісторыя: праблемы выкладання. 2009. № 7. С. 3—7.

[20] Учебные программы для общеобразовательных школ с русским языком обучения. Всемирная история. История Беларуси. V—XI классы / Нац. ин-т образования. Мн., 2009. С. 9—10.

[21] Гісторыя Беларусі, канец XVIII — пачатак XX ст.: вучэб. дапам. для 9-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання / С.В.Марозава, У.А.Сосна, С.В.Паноў; пад рэд. У.А.Сосны. Мн., 2011.

[22] Гісторыя Беларусі: XIX — пачатак XX ст. XI клас // Программы на 2009/10 учебный год // Гісторыя: праблемы выкладання. 2009, № 7. С. 44—46.

[23] Гісторыя Беларусі: канец XVIII — 1996 г. : вучэб. дапам. для вучняў 11-га кл. У 2 кн. Кн. 1 / В.Э.Загарульская, І.Л.Качалаў, В.У.Лютава [і інш.]; пад рэд. Я.К.Новіка, В.А.Цяпловай. Мн., 1996. С. 3.

[24] Там жа. С. 141.

[25] Гісторыя Беларусі: канец XVIII — 1999 г.: вучэб. дапам. для 11-га кл. агульнаадукац. шк. з бел. і рус. мовамі навучання / І.Л.Качалаў, Г.С.Марцуль, Н.Я.Новік [і інш.]; пад рэд. Я.К.Новіка. Мн., 2000. С. 3, 204.

[26] Гісторыя Беларусі: XIX — XX стст.: вучэб. дапам. для 11-га кл. агульнаадукац. шк. з бел. і рус. мовамі навучання / С.В.Паноў, У.Н.Сідарцоў, В.М.Фамін; пад рэд. М.С.Сташкевіча. Мн., 2001.

[27] Гісторыя Беларусі, XIX — пачатак XXI ст.: вучэб. дапам. для 11-га класа ўстаноў, якія забяспечваюць атрыманне агульнай сярэдняй адукацыі, з беларускай і рускай мовамі навучання з 11-гадовым тэрмінам навучання (базавы і павышаны ўзроўні) / І.І.Коўкель, Э.С.Ярмусік; пад рэдакцыяй А.А.Кавалені. Мн., 2006.

[28] История Беларуси с древнейших времён до октября 1917 года: учеб. пособие для 10-го кл. общеобразоват. учреждений с рус. яз. обучения / Я.И.Трещенок, А.А.Воробьёв, В.В.Волженков; под ред. Я.И.Трещенка. Мн., 2008.

[29] Там жа. С. 205.

[30] Там жа. С. 212.

[31] Там жа. С. 213—214.

[32] Там жа. С. 214, 215.

[33] Гісторыя Беларусі, XIX — пачатак XXI ст.: вуч. дапам. для 11-га кл. агульнаадукац. устаноў з бел. мовай навучання / Я.К.Новік [і інш.]; аўт. метад. апарату В.В.Гінчук ; пад рэд. Я.К.Новіка. Мн., 2009.

[34] Там жа. С. 80.

[35] Гісторыя Беларусі: XIX — XX стст.: вучэб. дапам. для 11-га кл. агульнаадукац. шк. з бел. і рус. мовамі навучання / С.В.Паноў, У.Н.Сідарцоў, В.М.Фамін; пад рэд. М.С.Сташкевіча. Мн., 2001. С. 61—62.

[36] История Беларуси с древнейших времён до октября 1917 года: учеб. пособие для 10-го кл. общеобразоват. учреждений с рус. яз. обучения / Я.И.Трещенок, А.А.Воробьёв, В.В.Волженков; под ред. Я.И.Трещенка. Мн., 2008. С. 227.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ